Фалітарык У.В., студ. гр. 214а ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.,
кандыдат філалагічных навук, прафесар

# ВЯСЕЛЬНЫ АБРАДА "УДОД" ВЁСАК ХАРОШЧА І СТАЙКІ ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА

Вяселле - гэта адно са свят , якое пакідае ў памяці маладых самыя яскравыя ўражанні на усё жыццё. Многія навукоўцы называюць вяселле "народнай операй"(Е. Раманаў), таму што тут увасобіліся самыя яскравыя і цікавыя абрады, якія спрыяюць дабрабыту і шчасцю маладых. Вядома, што вяселле вызначаецца багаццем рытуальных дзей. Яны не існуюць без варыянтаў, таму вясельныя абрады таксама паўсюдна на Беларусі маюць свае лакальныя адметнасці. Вывучаючы вяселле, і сёння можна сустрэць яго мясцовыя асаблівасці, невядомыя ў навуцы .

Сярод вясельных абрадаў захаваліся такія, што спрыяюць прыгажосці і пладавітасці маладой, але абрадаў, што спрыяюць моцы мужчынскага пачатку, зафіксавана вельмі мала.

Так, нам давялося пабываць у вёсцы Харошча Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці, і прысутнічаць на вяселлі. Там мы пачулі сярод бабулек такую гаворку: "А удод будзе, ці не?" Спачатку мы падумалі што гэта нейкі чалавек па мянушцы Удод. Аднак аказалася ўсё не так . Мясцовая жыхарка вёскі Харошча Соф*я Барысаўна Абрамчук (1956 г. н.) расказала нам пра гэты абрад наступнае. Прыводзім яе словы незмяняючы: "У пятніцу каравай пяклі і пяклі удод птушку прыгожую, і з мужскім багацтвам гэтую птушку. А калі прыязжаў у суботу малады за нявестаю, то пераадзетыя жанчынкі стаялі на покуці з гэтай птушкай . Яна была упрыгожаная , і ішлі дружкі і павінны былі выкупіць гэтую птушку. Было весела, трэбавалі жанчынкі кожная больш каб узяць грошай , а хлопцы каб без грошай украсці яе. Там было так весела, усе назіралі хто прысутнічаў на вяселлі. І калі не устрайвалі гэтыя хлопцы, то жанчынкі гэты удод кідалі у народ. Людзі лавілі, і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шчыталася за вялікае шчасце паймаць гэты удод… Гэта было да выкупа нявесты. Як толька прыязджалі адразу, дажа дзе брама была у нявесты, то іх прапускалі… Толькі гэты адзін момант быў, а потым на вяселлі яго ужо забіралі і усё. У нашай мясцовасці гэта было оёй! Апрануты каравайніцы былі ў цыганоў, хто што мог, і салдаты былі , я помню жанчынка у нас, яна такая высокая, заўсёды была салдатам… ”

Гэтым абрадам мы вельмі зацікавіліся, і хацелася даведацца больш і больш звестак пра яго. Аказваецца, у адной і той жа невялічкай вёсцы Харошча захаваліся варыянты гэтага абрада. Так нам паведала пра гэты абрад Марыя Віктараўна Вазнішчык (1932г. н.) наступнае: “…То бытто мужчына быў, гэтая птушка удод называлася, яйцо саджалі гэтаму ўдоду. І ужо калі каравай на стале паставяць, а усе у дзвярах стануць і выкупляюць, а каравайніцы, называліся мы - “Дзеньгі давайце нам ”. Мы чудзілі ўжо з імі . Перадзяваліся гэдык хто ў што, (…) мужыка адзенуць у жэншчыну. Потым ужо як выкуп дадуць, то мы кідалі яго. Хто паймае, і па кусочку падзеляць таго ўжо ўдода.(…) А цвяточкамі уквечвалі , птушка гэтая як голуб. У нас было ў вёсцы наймудрэй….”

Выпечка гэтай птушкі таксама мела свае адметнасці . Напрыклад у вёсцы Харошча пры выпячцы ўдода ў яго ўстаўлялі яйка. А ў той жа час у вёсцы Стайкі існаваў другі спосаб выпечкі , Ніна Пятроўна Фалітарык (1947г. н.) расказала нам : “…Бяруць цесто, раскачваюць такім калачом, потым завязваюць вузел, адзін канец расплясквaюць хвосціка і наразаюць . Другі канец падымаюць угору, робяць дзюбку , робяць увярху такі грабянёк, і той грабянёк нарэзваюць. У вочы саджаюць спічачкі- серкі. Бакі, дзе гэты вузел так нарэзваюць трошачкі, з аднаго боку, і з другога, і выходзяць как крыльцы . І ў печ, пасля, как яна спячэцца, пер*е саджаюць, і усё. Гэта пякуць увечары каравайніцы, каравайніцы адзетыя ў белыя кафта і юпкі, і ўперадзе фартух вышыты , і у хустцы. А на другі дзень свадзьбы, ужо, хто как адзеты, садзяцца за стол, ставяць два караваі , бяруць гэтую птушку. Ну

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спяваюць, але у нас не было такіх песень спецыяльных, танцуюць з гэтаю птушкаю, сваты стараюцца выхваціць з рук, а нето даюць каравайніцам дзенюшкі , і усё, сват забірае птушку сібе. Маладым гэтую птушку не паказвалі, рабілі гэта перад дарэннем, тады не пераапраналіся…

Мясцовыя бабулі нам паведамілі: “Адкуль пайшла назва гэтага абрада ніхто не ведае, гэта з вякоў вечных у нас такое вялося, яшчэ нашыя мацярэ рабілі”.

Мы зацікавіліся чаму гэты абрад называецца “Удод”. Верагодна, што ўдод – гэта вельмі прыгожая птушка, якая рэдка сустракаецца на тэрыторыі Беларусі, і чалавек амаль не бачыць яе, таму што гэтая птушка ўцякае, калі адчувае прысутнасць чалавека. Яна вельмі прыгожая, з вялікім хвастом і з вельмі яскравым і featнакаляровым апярэннем. У яе на галаве знаходзіцца доўгі хахалок, які можа раскрывацца, яна мае таксама даўгаватую, але тоненькую дзюбу .

На нашу думку, абрад “Удод” у вёсках Харошча і Стайкі Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласц,і дае нам яскравае уяўленне аб абярэгу услаўленню мужчынскага пачатку, мужчынскай моцы, сямейнага дабрабыту. Скіраваны гэты абрад на дзетанараджэнне і прадаўжэнне чалавечага роду, на добрыя шлюбныя адносіны паміж маладым і маладой.

Выкананне гэтага абрада, гэта цэлая тэатралізаваная дзея у якой няма падзелу на выканаўцаў і гледачоў “…Я помню, набрала поўную шпрынцоўку самагонкі, а Варшавец, я яму пусціла ў рот, то нават і падзякаваў. ” расказала нам Алена Георгіеўна Кулецкая (1938г. н.).

На нашу думку рэжысёр можа ў сучасным вяселлі узнавіць гэты абрад. Зрабіць гэта не цяжкая справа, але свята атрымае выключную мясцовую ўнікальнасць. Трэба адзначыць прыгожую эстэтычную асалоду гэтай вясельнай рытуальнай дзеі, якая у мастацкім вырашэнні дазволіць рэжысёру раскрыць бясконцае вобразнае бачанне народа ў вясельнай традыцыі,у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыватнасці, прадаўжэнні чалавечага роду. Раскрыць гэту высокародную мастацкую задачу дапаможа ажыццявіць абрад “Удод”.

Такім чынам абрад “Удод” дае нам яскравае уяўленне пра абярэг мужчынскай моцы і прадаўжэння чалавечага роду. Можна зрабіць выснову што не ўсе рытуальныя дзеі беларускага вяселля запісаны і даследаваны навукоўцамі. Іх вывучэнне дазваляе сучаснаму рэжысёру ўзбагаціць палітру рэжысуры рэгіянальнага вясельнага абраду. Рэстаўрыруючы знойдзеныя рэгіянальныя вясельныя абрады, рэжысёр узбагачае скарбонку мастцкай культуры беларусаў, прыўносіць у яе бясконцую мясцовую самабытнасць і арыгінальнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ